# Аркадзь Куляшоў
# балада “Маці”
## (урок беларускай літаратуры, 8 кл.)

Галіна Сухава,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
гімназіі №5 г. Віцебска

© Nastaunik.info
2017

Аркадзь Куляшоў (1914-1978)



Што ўслаўляе балада Аркадзя Куляшова “Маці”?



# Балада Аркадзя Куляшова “Маці”

Баладу чытае Сяржук Сокалаў-Воюш

24 Äîðîæêà 24.wma

## На што будзем звяртаць увагу

1. Асоба Аркадзя Куляшова
2. Балада як жанр ліра-эпасу
3. Замова як аснова твора
4. Кампазіцыя твора
5. Вобразы зерня, дарогі, вярбы, каменя
6. Час напісання балады “Маці”

# Аркадзь Куляшоў “Бывай…”



# Аркадзь Куляшоў



На Бранскім фронце, 1943

24 чэрвеня А. Куляшоў пакідае разбураны Мінск, пяшком прайшоўшы « горкі шлях » да Оршы, а ў Калініне добраахвотна ўступае у рады Чырвонай Арміі. Пасля вучобы ў Ноўгарадскім ваенна-палітычным вучылішчы А. Куляшоў працуе у армейскай газеце « Знамя Советов ». На старонках франтавога друку паэт расказвае пра суровую праўду змагання з фашысцкімі вылюдкамі, пра мужнасць і стойкасць байца-камсамольца на Бранскім фронце, якога фашысты на марозе аблілі вадой, пра безыменнага мінаметчыка, які на сваім участку стрымлівае наступленне фашысцкай дывізіі.

MyShared

# Чаму Аркадзь Куляшоў піша баладу, а не верш?

- Балада - раматычна напружаны, сюжэтны ліра-эпічны верш казачна-фантастычнага, легендарна-гістарычнага ці гераічнага зместу.
- У аснове балад ляжаць незвычайныя, нярэдка трагічныя падзеі ў жыцці чалавека, гераічныя моманты ў жыцці грамадства, пэўнага сацыяльнага асяроддзя.

# Балада

- У гады Другой сусветнай вайны Аркадзь Куляшоў стварыў цэлы баладны цыкл пра подзвіг беларускага народа ў часы ліхалецця, у рамках якога вылучаюцца вершы-балады “Ліст з палону”, “Балада аб чатырох заложніках”, “Маці”.
- Яны грунтуюцца на пэўных выпадках, эпізодах, здарэннях і з’яўляюцца адбіткам суровай біяграфіі ваеннага пакалення.

# Сюжэтная аснова балады “Маці” - замова

Так завуцца слоўныя творы чалавека, якімі ён спрабуе кіраваць сіламі прыроды на сваю карысць. І ці то з просьбамі, ці то з пагрозамі ды загадамі звяртаўся чалавек да розных прыродных сіл і з’яў.

Замовы казаліся з вялікім пачуццём і ўвасабленнем, чулым, і прыгожым словам. Даючы, як здавалася людзям, патрэбныя вынікі, замовы пераходзілі з вуснаў у вусны, з роду ў род.

**Замова і малітва** - паняцці сходныя, толькі ў замове пераважае загад, а ў малітве просьба.

# Знайдзіце ў тэксце сюжэт народнай замовы

*На бітву крывавую сына праводзіўшы з хаты,*
*На шчасце і ўдачу пасеяла маці зярняты.*
*Калі дачакаецца маці з тых зерняў усходу,*
*Сын прыйдзе з паходу,*
*Са славаю прыйдзе з паходу.*

Паспрабуйце патлумачыць сакральнае значэнне названых магічных дзеянняў?

Можна сказаць, што яны перадаюць пакуту, гора маці?

У народным разуменні ў чым прызначэнне замовы?

# Чаму замова ў баладзе А.Куляшова не дапамагла маці?

Якое рашэнне прымае лірычная гераіня балады?

*Ля каменя ўпала*
*Цярплівая маці ў знямозе,*
*У роспачы скардзіцца стала*
*Знаёмай дарозе:*
*«Пачуй мае словы,*
*Улашчы свой камень суровы,*
*За гэта вярбою*
*Гатова я стаць над табою…*

# Чаму не ўдалося дамовіцца з дарогай?

Якое наступнае рашэнне прымае лірычная гераіня?

*З дарогі ўставала*
*І каменю маці казала:*
*«Вады табе мала*
*І матчыных слёз табе мала,*
*Цяпер я крывёю*
*Сваёю*
*Цябе праклінаю:*
*Ты станеш зямлёю,*
*А каменем стану сама я».*

*І тройчы такою*
*Кляцьбою*
*Той камень праклята.*
*Стаў камень зямлёю,*
*Сама ж яна каменем стала.*

# Кампазіцыя балады

- На якія лагічныя часткі вы падзялілі б твор?
- Падумайце, якое значэнне мае будова твора для выражэння ідэі. **Абмяркуйце ў парах.**
- Якім бы вы назвалі фінал твора - трагічным ці жыццесцвярджальным?
- Які жанр вуснай народнай творчасці нагадвае твор?

# Сістэма вобразаў у баладзе

Паспрабуйце патлумачыць вобразную сімволіку балады:

- **Зерне –**
- **Камень –**
- **Дарога –**
- **Вярба –**

Паэт у баладзе двойчы звяртаецца да вобраза каменя. Ці заўсёды размова ідзе пра адно і тое ж?

# “Балада аб чатырох заложніках”

...Татка, татка... забыў нас... пакінуў.
- Спі, засні, - суцяшае кабета, -
Спі, сынок, не твая гэта справа.
Спі, наш татка не прыйдзе,
На гэта
Ён не мае бацькоўскага права.
Ноч праходзіць,
Сонца ўзыходзіць,
Заспявалі жаўранкі ў полі.
Іх выводзяць салдаты
За краты.
Хлопчык рад і сонцу, і волі.
Іх салдат
Дда сцяны прыстаўляе.

Цэліць кат
У льняныя галовы,
Пачынае
З сына Міная.

Стрэл.
Упаў хлапчук трохгадовы...
Кат ізноў пісталет узнімае...
На сцяне - заложнікаў цені...

Вось і ўсё.
Перад бацькам Мінаем
Станьце, ўсе бацькі, на калені!

*Чэрвень 1942 г.*

Помнік Анастасіі Акацьеўне Ларыёнавай у Омску



Помнік Марыі Мацвееўне Фраловай. Расія



Помнік салдацкай маці Праскоўі Ерамееўне Валодзічкінай. Расія



Помнік
Настассі
Фамінічне
Купрыянавай.
Жодзіна.
Беларусь








Што ўслаўляе балада Аркадзя Куляшова “Маці”?



# На што будзем звяртаць увагу

1. Асоба Аркадзя Куляшова
2. Балада як жанр ліра-эпасу
3. Замова як аснова твора
4. Кампазіцыя твора
5. Вобразы зерня, дарогі, вярбы, каменя
6. Час напісання балады “Маці”

# Адказ на ключавое пытанне ўрока

Што ўслаўляе балада
Аркадзя Куляшова “Маці”?

# Дамашняе заданне

